*УДК 316.77, 008*

# КУЛЬТУРНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ: ПЕРСАНАЛЬНЫ ВЫБАР ЦІ САЦЫЯЛЬНАЯ НОРМА

***А. Д. КРЫВАЛАП***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*вул. Рабкараўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Асэнсоўваецца феномен ідэнтычнасці як сканструяваная сацыяльная норма. Разглядаецца пошук уласнай культурнай ідэнтычнасці як сацыяльна-культурны абавязак, а не як індывідуальны выбар. Падаецца перспектыўным аналіз пытання наяўнасці ідэнтычнасці па-за межамі псіхалогіі. Паказваюцца змены ў сучасным філасофска-культуралагічным разуменні культурнай ідэнтычнасці ў кантэксце кагнітыўных здольнасцей асобы. Вызначаюцца сувязі паміж магчымымі інтэрпрэтацыямі разумення культурнай ідэнтычнасці па-за межамі псіхалогіі. Адзначаецца, што канструяванне культурнай ідэнтычнасці спрыяе пошуку адказаў на пытанні адносна магчымасцей для пераасэнсавання чалавечага існавання ў межах культуры.

***Ключавыя словы:*** культурная ідэнтычнасць; памяць; практыка; рэчаіснасць.

# КУЛЬТУРНАЯ ИДЕНТИЧНОСТЬ: ПЕРСОНАЛЬНЫЙ ВЫБОР ИЛИ СОЦИАЛЬНАЯ НОРМА

***А. Д. КРИВОЛАП***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет культуры и искусств,*
*ул. Рабкоровская, 17, 220007, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Осмысливается феномен идентичности как сконструированная социальная норма. Рассматривается поиск собственной культурной идентичности как социокультурная обязанность, а не как индивидуальный выбор. Представляется перспективным анализ вопроса наличия идентичности вне границ психологии. Показываются изменения в современном философско-культурологическом понимании культурной идентичности в контексте когнитивных возможностей личности. Определяются связи между возможными интерпретациями понимания культурной идентичности вне границ психологии. Отмечается, что конструирование культурной идентичности способствует поиску ответов на вопросы, касающиеся возможностей переосмысления человеческого существования в рамках культуры.

***Ключевые слова:*** культурная идентичность; память; практика; реальность.

**Образец цитирования:**
Крывалап АД. Культурная ідэнтычнасць: персанальны выбар ці сацыяльная норма. *Человек в социокультурном измерении.* 2025;1–2:15–19.
EDN: GOIKWB

**For citation:**
Krivolap AD. Cultural identity: personal choice or social norm. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2025;1–2: 15–19. Belarusian.
EDN: GOIKWB

**Автор:**
***Алексей Дмитриевич Криволап*** – кандидат культурологии; профессор кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин Института повышения квалификации и переподготовки кадров.

**Author:**
***Alexei D. Krivolap***, PhD (cultural studies); professor at the department of cultural studies, psychology, and pedagogy, Institute of Professional Development and Retraining of Human Resources.
*email2krivolap@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-4478-4930*

CC BY NC

Человек в социокультурном измерении. 2025;1–2:15–19
Human in the Socio-Cultural Dimension. 2025;1–2:15–19

# CULTURAL IDENTITY: PERSONAL CHOICE OR SOCIAL NORM

***A. D. KRIVOLAP***[a]

[a]*Belarusian State University of Culture and Arts, 17 Rabkarawskaya Street, Minsk 220007, Belarus*

***Abstract.*** The phenomenon of identity is understood as a constructed social norm. The search for one's own cultural identity is considered as a socio-cultural obligation, not as an individual choice. A prospective analysis of the issue of the existence of identity outside the boundaries of psychology is presented. Changes in the modern philosophical and culturological understanding of cultural identity in the context of the cognitive abilities of the individual are shown. Connections between possible interpretations of the understanding of cultural identity outside the boundaries of psychology are determined. It is noted that the construction of cultural identity contributes to the search for answers to questions regarding the possibilities for rethinking human existence within the framework of culture.

***Keywords:*** cultural identity; memory; practice; reality.

## Уводзіны

Што можа пераканаць нас у тым, што чалавек мае ідэнтычнасць? Усё, што звязана з нашай свядомасцю, так ці інакш адносіцца да кагнітыўнай дзейнасці нашага розуму. Аніякія іншыя органы чалавечага цела не могуць адказваць за наяўнасць ідэнтычнасці. Толькі ў стане свядомасці чалавек можа адказаць на пытанне, кім ён сябе лічыць. Дадзены адказ непазбежна не будзе супадаць з тым, кім гэтага чалавека могуць лічыць іншыя людзі, асабліва калі размова ідзе не пра глабальнае несупадзенне ацэнак, а пра дробязі і суб'ектыўныя меркаванні.

Аднак наяўнасць ідэнтычнасці – гэта індывідуальны выбар ці сацыяльная норма? Калі размова ідзе пра асобу, якая ствараецца падчас сацыялізацыі індывіда, то гэта хутчэй сацыяльна-прымальная норма, што прадпісвае і патрабуе адпаведнасці калектыўным уяўленням. У такім выпадку пошукі ўласнай культурнай ідэнтычнасці могуць разглядацца як сацыяльна-культурны абавязак, а не індывідуальны выбар. Падаецца перспектыўным разгляд пытання ідэнтычнасці па-за межамі псіхалогіі, не адмаўляючы псіхалагічны падыход, але спрабуючы не абмяжоўвацца ім. Магчыма, што для культуролагаў будзе цікавым звярнуцца да філасофскіх спроб пераасэнсавання феномена ідэнтычнасці, бо калі нас цікавіць ідэнтычнасць як суадносіны часткі і цэлага, то гэта пытанне да нашых кагнітыўных здольнасцей.

Мэтай артыкула з'яўляецца паказ змен у сучасным філасофска-культуралагічным разуменні культурнай ідэнтычнасці ў кантэксце кагнітыўных здольнасцей асобы. Актуальнасць праблемы крызіса цэласнай ідэнтычнасці і яе наяўнага фрагментарнага ці пластычнага характару ва ўмовах постсучаснасці ўжо практычна не выклікае здзіўлення. Тое, што мы робім сёння, мае патэнцыйны ўплыў на ідэнтычнасць наступных пакаленняў праз стварэнне гісторыі. Адпаведным чынам, культурныя практыкі, скіраваныя як на захаванне, так і на стварэнне рытуалаў, абрадаў, цырымоній, з'яўляюцца працай з вобразам будучыні, пра якую зараз варта думаць. Сёння людзі вызначаюцца не толькі праз класічныя маркеры ідэнтычнасці (месца нараджэння, этнічнасць, паходжанне, рэлігія). У сувязі з гэтым мае сэнс звярнуцца да першакрыніц, з якіх узнікла цікаўнасць да асобы і яе тоеснасці. Як так склалася, што наяўнасць ідэнтычнасці ўспрымаецца як сацыяльна-культурная норма, а кожны чалавек павінен ведаць ці быць здольным вербалізаваць думкі адносна наяўнасці ўласнай ідэнтычнасці.

Калі за мысленне адказвае розум, які з'яўляецца адносна невялікай часткай нашага цела, то як мы можам разумець сябе адзіным цэлым? Толькі частка нашага цела здольна да мыслення – гэта розум. Аднак розум – гэта далёка не ўсё цела. Большая частка нашай жыццядзейнасці (дыханне, цыркуляцыя крыві, функцыянаванне страўніка і інш.) адбываецца ў фонавым рэжыме. Шмат якія працэсы не заўсёды і далёка не цалкам знаходзяцца пад кантролем свядомасці. Так, імі кіруе розум, але не свядомасць. Спроба філасофскай рэфлексіі феномена наяўнасці персанальнай ідэнтычнасці распачалася яшчэ ў XVII ст. з прац Дж. Лока і працягваецца ў розных варыянтах да сённяшняга дня.

## Цяжкасці пераклада

У першую чаргу варта адзначыць, што Дж. Лок ужывае менавіта словазлучэнне *personal identity*, што можа быць перакладзена як «персанальная ідэнтычнасць», як «асабістая ідэнтычнасць», а таксама як «тоеснасць асобы». Аднак паміж тэрмінамі «персанальная ідэнтычнасць» і «тоеснасць асобы» існуе пэўны дыскурсіўны разрыў, яны маюць розныя філасофска-культуралагічныя традыцыі інтэрпрэтацыі. Праблем

з інтэрпрэтацыяй паняцця *personal identity* няма, але гэтая шматсэнсоўнасць з'яўляецца тэмай, вартай асобнага даследавання. Адзначым, што пераклады, зробленыя ў часы СССР, ўключаюць менавіта тэрмін «тоеснасць асобы» («тождество личности»), што стварае дадатковыя магчымасці для альтэрнатыўных інтэрпрэтацый і тлумачэнняў феномена ідэнтычнасці. Імаверна, у часы Дж. Лока цэнтральным пытаннем пошукаў персанальнай ідэнтычнасці была менавіта магчымасць захавання адпаведнасці самому сабе ў мінулым. У XX ст. распрацоўкі сацыяльнага канструктывізму дазволілі пераасэнсаваць пытанне ідэнтычнасці. Ідэнтычнасць стала разглядацца як паслядоўнасць адказаў на разнастайныя пытанні і практычныя дзеянні на працягу ўсяго жыцця, а не як вызначаны набор адметнасцей, атрыманых падчас нараджэння. Гэты артыкул не мае мэты стварыць правільную канцэпцыю разумення філасофскай спадчыны Дж. Лока, ён хутчэй з'яўляецца спробай пашырыць магчымасць для інтэрпрэтацыі добра вядомага падыходу да ідэнтычнасці. У дадзеным артыкуле ў якасці перакладу будзе выкарыстоўвацца «персанальная ідэнтычнасць». Следам за Дж. Локам заўважым, што «цяжкасць паходзіць з няправільнага ўжывання назваў»[1] [1, с. 401].

Згодна з вызначэннем Дж. Лока асоба – «разумная думаючая істота, якая мае розум і рэфлексію і можа разглядаць сябе як сябе, як тая самая думаючая істота, у розны час і ў розных месцах» [1, с. 387]. Гэта азначэнне – тэзіс пра тое, што, з аднаго боку, атрыбутам чалавечага быцця з'яўляецца мысленне як працяг картэзіянскага сцвярджэння *cogito, ergo sum*, а з іншага боку, як паспяхова даказвае штодзённая практыка грамадства спажывання, чалавек можа існаваць з «выключаным» крытычным мысленнем і не пакутаваць ад цяжкасцей уласнага існавання. Для Дж. Лока «адну і тую ж асобу ўтварае не адна і тая ж субстанцыя, а адна і тая ж бесперапынная свядомасць, з якой могуць злучацца і зноў распадацца розныя субстанцыі, якія раней складалі частку гэтай самай асобы ўвесь час, пакуль яны заставаліся ў жыццёвым яднанні з тым, у чым тады існавала гэта прытомнасць» [1, с. 399]. Непасрэдна кагнітыўныя здольнасці чалавечай свядомасці ўтвараюць асобу, калі «бесперапыннае існаванне стварае ідэнтычнасць» [1, с. 401].

Менавіта з бесперапыннасцю ці адсутнасцю лакун у разуменні мінулага і ўзнікаюць пытанні. Калі асоба выпадае на некаторы час са звыклага сацыяльнага жыцця, то вяртанне да яго можа быць траўматычным і складаным. Як заўважае сам Дж. Лок, «калі для каго-небудзь ідэя чалавека ўяўляе сабой толькі жыццёвае злучэнне часціц у целе вызначанай формы, то, пакуль будзе заставацца гэтае жыццёвае яднанне і форма ў злучэнні, тоесным толькі ў бесперапыннай паслядоўнасці зменлівых часціц, яно і будзе тым жа самым чалавекам» [1, с. 402]. Для Дж. Лока асоба як сума уласных уяўленняў пра сябе не з'яўляецца праблемнай. Яна разглядаецца самадастатковай і цэласнай.

## Канцэптуалізацыі персанальнай ідэнтычнасці

У XX ст., пасля з'яўлення тэорыі псіхааналізу, ідэнтычнасць надоўга патрапіла ў залежнасць ад псіхалогіі і псіхалагічных канцэпцый. Асабліва садзейнічаў гэтаму Э. Эрыксан. Толькі ў другой палове XX ст. у межах філасофіі пачалі распрацоўвацца канцэптуальныя падыходы да пераасэнсавання і разумення ідэнтычнасці, якія прэтэндавалі на выхад за межы псіхалагічнага тлумачэння ідэнтычнасці. У 1970-я гг. Д. Парфіт звяртаецца да пытання тоеснасці як непарыўнасці ідэнтычнасці і прыходзіць да правакатыўнай высновы пра тое, што памяць не гарантуе наяўнасць ідэнтычнасці, таму што ўспаміны могуць быць дапоўнены, заменены вывучанымі ўспамінамі ці пераасэнсаваны ў штодзённай практыцы.

Крытыкуючы празмернае тлумачэнне важнасці псіхалагічнага разумення ідэнтычнасці, Д. Парфіт прапануе два палажэнні: 1) «…уяўленне грунтуецца на прызнанні таго, што пытанне пра персанальную ідэнтычнасць абавязкова павінна мець адказ» [2, p. 3]; 2) «…некаторыя важныя пытанні сапраўды закранаюць сітуацыю з персанальнай ідэнтычнасцю, але нават яны могуць быць вольнымі ад гэтых спекуляцый» [2, p. 4]. Сучасная культура знаходзіцца ў закладніках памяці, сувязі паміж тым, што мы памятаем, з'яўляюцца самымі галоўнымі. Д. Парфіт адзначае, што «…мы з лёгкасцю верым, што сведчанні памяці павінны непасрэдным чынам закранаць нашу ідэнтычнасць. Сляпая вера ў нашу памяць з'яўляецца найважнейшым чыннікам узнікнення ўяўленняў пра адмысловую прыроду персанальнай ідэнтычнасці. <…> Мы здольны памятаць толькі свае ўласныя перажыванні, і, цалкам магчыма, гэтае сцвярджэнне служыць нам адной з лагічных ісцін. Аднак мы маглі б паспрабаваць прапанаваць іншае паняцце памяці, для якога падобнае сцвярджэнне апынецца ілжывым. Давайце назавём такое паняцце "q-памяць"» [2, p. 14]. Прапанаваны тэрмін «q-память» з'яўляецца скарачэннем. Цікава, што на яго звычайна не звяртаюць належнай увагі. Паняцце «q-память» (англ. *quasi-memory* – квазіпамяць) азначае, што частку нашай памяці займаюць вывучаныя ўспаміны, а не тое, што мы перажылі асабіста. Такія ўспаміны ствараюцца з дапамогай трох паслядоўных дзеянняў. Спачатку ствараецца ўяўленне адносна некаторых падзей мінулага, затым знаходзяцца сведкі, якія перажывалі гэтыя падзеі і маюць ўспаміны пра іх, і ў выніку

[1]Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*

нашы індывідуальныя ўяўленні дапаўняюцца, пашыраюцца і трансфармуюцца ва ўспаміны пра тое, што мы ў рэальнасці не перажывалі.

Гэты від памяці мае непасрэднае стаўленне да мінулага і працы з ім, асабліва калі гаворка ідзе пра ўспаміны, што даступны нашай памяці, але не звязаны з нашым індывідуальным вопытам. Медыя ў шырокім сэнсе ствараюць агульны парадак дня і задаюць магчымыя прыклады ўспамінаў пра мінулае ці яго ацэнак. Гэтыя ўспаміны і ацэнкі падобныя на альбом з дзіцячымі фотаздымкамі, на якіх мы адначасова пазнаем і не пазнаем сябе. Дакладней, сваякі навучылі нас пазнаваць сябе на іх, але нам не абавязкова памятаць, дзе былі зроблены гэтыя фотаздымкі. У такім выпадку няма адрозненняў паміж q-памяццю і сапраўднай памяццю.

Калі ідэнтычнасць асобы можа быць абмежавана тым, што яна памятае пра ўласнае мінулае, то хто ці што кантралюе памяць? Псіхалагічны падыход да вызначэння ідэнтычнасці праз стан свядомасці з'яўляецца вельмі непастаянным. Ён дазваляе пабачыць толькі пробліскі свядомасці, калі імгненні сучаснасці ператвараюцца ва ўспаміны. Д. Парфіт прапануе ідэю вызначэння ідэнтычнасці і памяці без выкарыстання *Я*. Замест індывідуальнай памяці ён заклікае арыентавацца на тое, што здарылася з чалавекам ці з яго целам. Згодна з гэтым падыходам памяць выступае прычынай таго, што цела належыць чалавеку як асобе незалежна ад таго, памятае ён гэта ці не. Іншымі словамі, Д. Парфіт не дапускае таго, каб персанальная ідэнтычнасць базіравалася на здольнасцях кагнітыўных функцый нашага розуму, таму што «большасць нашых бед грунтуецца на ілжывых уяўленнях» [2, p. 27], тады як цялеснасць ці біялагічныя асаблівасці чалавека не настолькі прыдатныя для маніпуляцыі.

## Чалавечая жывёла

Д. Парфіт прапанаваў падыход да крытычнага разумення нашых магчымасцей у пабудове персанальнай ідэнтычнасці без вызначальнай ролі псіхалогіі, а Э. Олсан развіў яго. На думку Э. Олсана, біялагічны падыход грунтуецца на наступных сцвярджэннях: «Па-першае, мы з вамі – жывёлы: калі быць дакладным, прадстаўнікі віду *homo sapiens*. <...> Але ўсе людзі – гэта жывёлы. Мы – тое, што Дж. Лок назваў “людзьмі”. Вы не проста цесна звязаны нейкім чынам з чалавекам-жывёлай. Сцвярджэнне не ў тым, што ваша цела – гэта чалавек-жывёла, ці што вы “складзены” з жывёлы. Гэты жывы прымат, які сядзіць зараз у вашым крэсле, – гэта вы. Другое сцвярджэнне больш спрэчнае: псіхалагічная бесперапыннасць не з'яўляецца ні неабходнай, ні дастатковай для таго, каб чалавек-жывёла існаваў у часе» [3, p. 30]. Розум, як частка нашага цела, думае ад імя цэлага, хаця ім не з'яўляецца. Асоба, як носьбіт культуры, выступае яе часткай і можа дзейнічаць ад яе імя. Культурныя практыкі будуюцца на фізіялагічных абмежаваннях цела. Чалавек не можа лётаць ці дыхаць пад вадой. Узнікае пытанне: гэта з'яўляецца нашым індывідуальным выбарам ці аб'ектыўным абмежаваннем цела? Не ўсё цела ўдзельнічае ў ментальнай актыўнасці, але мы адчуваем усё цела. Нават у маўленні прадстаўлены ўстойлівыя выразы, у якіх падкрэсліваецца нерацыянальны характар культуры (напрыклад, каханне і сэрца, смак і густ).

Якая частка нашага цела ўключана ў працэс стварэння культуры? Возьмем у якасці прыкладу тэкст. Калі аўтар піша тэкст, якія часткі яго цела задзейнічаны? Рукі аўтара? Пусты страўнік, калі мы верым, што мастак мусіць быць галодны? Вочы і наша ранейшая нагледжанасць – усё тое, што мы бачылі раней як візуальныя цытаты. Пісьмо не з'яўляецца натуральнай дзейнасцю, і таму ў школе нас навучылі прымаць адпаведную позу за партай. Там шмат часу надавалася развіццю дробнай маторыцы пальцаў рук, звярталася увага на пастанову ўсяго корпуса. Але ці зручна нам сядзець? Як мы пішам – ад рукі ці набіраем тэкст на клавіятуры? Ці ёсць нейкія знешнія чыннікі, што раздражняюць нас і адцягваюць нашу ўвагу? Усе гэтыя пытанні сведчаць аб тым, што не толькі вышэйшая псіхічная дзейнасць розума звязана са стварэннем культуры. Усё цела чалавека можа быць уключана ў гэты працэс. Як законы фізікі не працуюць у сацыяльна-культурнай сферы, так і няма залежнасці паміж выкарыстаннем кагнітыўных здольнасцей і наяўнасцю ідэнтычнасці. «Ідэнтычнасць мае канцэптуальна-адносны характар і залежыць ад існавання часовых частак» [2, p. 214].

## Працэсуальнасць мыслення, а не яго наяўны стан

З аднаго боку, кожная асоба павінна мець адказ на пытанне пра ўласную ідэнтычнасць. З іншага боку, адкуль чалавек можа ведаць, хто ён? Калі гэта залежыць ад ацэначных выказванняў іншых людзей, а калі ад таго, кім чалавек сам сябе можа ўявіць? Мець ідэнтычнасць азначае не простую адпаведнасць ідэалу, а актыўны кагнітыўны працэс у свядомасці асобы. Ідэнтычнасць ствараецца ў працэсе сацыяльнага канструявання, а не перадаецца ў спадчыну. Яна не існуе сама па сабе, а ствараецца (ажыццяўляецца, рэалізуецца, пражываецца, думаецца і інш.) ў працэсе практычнай дзейнасці асобы. Гэтыя тэзісы можна прымяніць і да культурнай ідэнтычнасці, дакладней да працэсаў яе канструявання і ажыццяўлення.

Чалавек не заўсёды дзейнічае рацыянальна і выбірае найбольш выгадны варыянт. «Часам лічыцца,

што вельмі рацыянальным было б дзейнічаць у найлепшых для сябе інтарэсах. Але я мяркую, што прынцып асабістай цікавасці не мае сілы. Такі прынцып мае толькі два сапраўдныя канкурэнты. Адным з іх з'яўляецца прынцып староннасці: рабі тое, што лепш за ўсё дазволіць дасягнуць сапраўды жаданага табой. Іншы – прынцып бесстароннасці: рабі тое, што адпавядае інтарэсам кожнага» [2, p. 26]. На чалавека аказваюць ўплыў эмацыйны складнік, традыцыі і гісторыя (напрыклад, новыя сацыяльныя нормы здаровага харчавання можа супярэчаць нацыянальным традыцыям і кулінарным практыкам).

Калі асоба – гэта вынік дзейнасці толькі розуму і таго, кім мы здольны сябе ўявіць, то што рабіць з тымі, хто існуе без падобнага ўяўлення і кіруецца патрэбамі цела ці досведам продкаў? Ці лічацца яны жывымі? Ці лічацца яны людзьмі?

Культурная ідэнтычнасць не мае ўніверсальнага характару на глабальным узроўні, а лакалізавана на розных ступенях штодзённай культурнай практыкі індывідаў. Яна трактуецца як частка працэсу рэпрэзентацыі і носіць перфарматыўны характар. Культурная ідэнтычнасць ствараецца не як статычны варыянт падабенства да якога-небудзь ідэальнага аб'екта, а з'яўляецца дынамічнай часткай працэсу асэнсавання і канструявання чалавекам самога сябе ў працэсе рэпрэзентацыі. Можна сказаць, што і ў межах філасофіі адбываецца паварот ад наяўнай да працэсуальнай ідэнтычнасці. Працэсуальная ідэнтычнасць не з'яўляецца па факце нараджэння, а пастухова ствараецца на працягу ўсяго жыцця. Яна выступае не ступенню адпаведнасці самому сябе ці нейкім нарматыўным узорам з мінулага, а паслядоўнай серыяй адказаў на шырокі спектр пытанняў.

## Заключэнне

Культурная ідэнтычнасць як сацыяльнае станаўленне – гэта працэс, што актуалізуе практыкі прыналежнасці да адпаведнай культуры, якія сцвярджаюць яе каштоўнасць. Як кропля вады не можа існаваць ў Сусветным акіяне адасоблена, так і чалавек, дакладней асоба, не можа быць аўтаномным і ізаляваным ад грамадства (сацыяльнага мора). Персанальная ідэнтычнасць можа не абмяжоўвацца фізіялогіяй і межамі ўласнага цела. Культура дазваляе нам працягнуць наша існаванне праз творчасць, заставіць пасля сябе артэфакты, што будуць сведчыць пра нас больш, чым мы можам распавесці. Сацыяльная норма прадпісвае асобе калі не дакладна ведаць, то як мінімум быць здольным адказаць на пытанне, хто ты гэткі.

У ходзе развіцця ідэнтычнасці знакамітае шэкспіраўскае пытанне «быць ці не быць?» падаецца магчымым трансфармаваць у пытанне «быць сабой ці застацца сабой?». У гэтым кантэксце застацца сабой для чалавека як часткі жывёльнага свету значыць быць верным ўласнай прыродзе (рыгідная наяўная форма ідэнтычнасці). Менавіта пераадоленне прыродных (натуральных) абмежаванняў дазваляе нам праз стварэнне культуры як другой натуры быць людзьмі, быць у сэнсе існавання як актыўнай дзейнасці. Мы не падпарадкоўваемся таму, што было дадзена ад нараджэння, а імкнёмся жыць у адпаведнасці з уяўленымі нормамі і каштоўнасцямі. Быць сабой у гэтым выпадку значыць актыўна жыць і разумець самім сябе. Захаванне памяці без адмаўлення мінулага – гэта праява пражывання ідэнтычнасці.

Функцыянальны розум з'яўляецца толькі часткай нашага розуму. Наша свядомасць як вынік рэфлексіі і асэнсавання больш не абмяжоўваюцца пошукамі адказаў на пытанні функцыянальнага кшталту. Асоба ўвесь час трансфармуецца як на ўзроўні біялогіі, так і на ўзроўні псіхалогіі, але пры гэтым у яе захоўваецца ўсведамленне сябе. Мы памятаем мінулае ці саміх сябе ў мінулым? Гэта не адно і тое ж. Чалавечае быццё – гэта ўсвядомленае і асэнсаванае існаванне асобы, што суправаджаецца перманентнымі спробамі трансфармацыі і захавання памяці. Ідэнтычнасць можна разглядаць як вынік і доказ існавання асобы. Аднак наяўнасць асобы не гарантавана чалавеку ад нараджэння.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Локк Дж. *Сочинения. Том 1.* Москва: Мысль, 1985. Опыт о человеческом разумении; с. 78–620.
2. Parfit D. Personal identity. *Philosophical Review*. 1971;80(1):3–27.
3. Olson E. *The human animal: personal identity without psychology.* Oxford: Oxford University Press; 1999. 196 p.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 13.06.2025.*
*Received by the editorial board 13.06.2025.*